Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (145), 2024

УДК 94:327:339.5((47+57):438):070(438)”1932-1933” EDN: GQMGEZ

# Адлюстраванне становішча савецка-польскіх гандлёвых адносін на старонках польскага друку ў 1932–1933 гг.

В.М. Бароўская

У артыкуле даследуецца становішча савецка-польскіх гандлёвых адносін на аснове матэрыялаў польскага перыядычнага друку канца ліпеня 1932 г. – сярэдзіны лістапада 1933 г. Даказваецца, што планамерная падрыхтоўка да заключэння «Дагавора аб ненападзенні» з Польшчай узняла на павесцы дня і пытанне паляпшэння савецка-польскіх гандлёвых адносін (падаўжэнне дагавора аб «Саўпольгандлі» (17 лютага 1933 г.), нармалізацыя пытання аб чыгуначных тарыфах, падпісанне канвенцыі аб сплаве лесу па памежных рэках (19 чэрвеня 1933 г.) і дамова аб экспарце драўніны).
**Ключавыя словы:** Рыжскі мірны дагавор, савецка-польскі гандаль, пакт аб ненападзенні, перыядычны друк.

The article examines the state of the Soviet-Polish trade relations on the basis of periodical materials from the end of July 1932 to the middle of November 1933. It is proved that the planned preparation for the conclusion of the «Non-Aggression Treaty» with Poland was also on the agenda and on the issue of improving the Soviet-Polish trade relations (extension of the agreement on «Sovietpolishtrade» (February 17, 1933), normalization of the issue of railway tariffed, signing of the convention on the rafting of timber along border rivers (June 19, 1933) and the agreement on the export of wood).
**Keywords:** Riga peace treaty, Soviet-Polish trade, nonaggression pact, periodicals.

Згодна з артыкулам XXI Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г., савецкі і польскі бок павінны былі не пазней, чым праз шэсць месяцаў з моманта ратыфікацыі дагавора пачаць перагаворы па заключэнні спецыяльнага Гандлёвага дагавора і дагавора аб кампенсацыйным тавараабмене. Артыкул XXII дагавора абавязваў бакі да моманту заключэння вышэй пералічаных міжнародных дакументаў арганізаваць бесперашкодны транзіт тавараў «па ўсім чыгуначным, водным шляхам, вольных для транзіту» [1, с. 640–641]. Усталяванне якасных гандлёвых сувязей з’ўлялася надзённым пытаннем для абодвух бакоў. Праз Польшчу праходзіла большасць гандлёвых шляхоў, якія вялі на Захад. Гэтая краіна з’ўлялася буйным суседам савецкіх рэспублік: працягласць пагранічнай лініі з ёй складала каля 1400 кіламетраў. Тым больш доўгачасовае знаходжанне часткі польскіх зямель у складзе Расійскай імперыі моцным чынам звязала эканоміку гэтых краін. Аднак па дадзеным Народнага камісарыята па знешняму гандлю, імпарт з Польшчы ў Савецкую Расію за дзевяць месяцаў 1921 г. склаў 486 тыс. руб., што складала ўсяго 0,2 % ад усяго імпарту Савецкай дзяржавы. Экспарт за адзначаны перыяд часу налічваў толькі 24 тыс. руб. [2, с. 28].

Для паляпшэння савецка-польскіх гандлёвых зносін адразу ж пасля заключэння Рыжскага мірнага дагавора пачаліся перагаворы паміж прадстаўнікамі Упраўлення ўпаўнапаважанага Народнага камісарыята знешняга гандлю РСФСР пры СНК БССР і польскімі прадпрымальніцкімі коламі (акцыянерныя таварыствы «Брытаполь», «Паланціна», «Заходнелес», «Гратэнаў»). Іх вынікам стала заключэнне некалькіх камерцыйных дагавораў на пастаўку ў савецкую краіну сельскагаспадарчых прылад працы, некаторых відаў харчавання (рыс, рыбныя кансервы, какава-бабы і інш.), хімічных злучэнняў (берталетава соль, чырвоны фосфар, парафін) [3]. 4 жніўня 1921 г. у Польшчу прыбылі першыя дыпламатычныя і гандлёвыя дэлегацыі на чале з Л.М. Караханам. З моманту іх уладкавання ў Варшаве было адчынена паўнамоцнае прадстаўніцтва РСФСР і УССР, у іх склад былі ўключаны і гандлёвыя прадстаўніцтвы ад БССР. Са свайго боку Польшча ўвяла пасаду саветніка па гандлі пры дыпламатычнай місіі ў Маскве.

Шматлікія спробы падпісання савецка-польскага гандлёвага дагавора (сустрэчы Стэфаньскага–Ганецкага, Страсбургера–Літвінава, Нарутовіча-Чычэрына, Дароўскага-Копа) не прынеслі станоўчага выніку. Планамерная падрыхтоўка да заключэння «Дагавора аб

ненападзенні» з Польшчай узняла на павесцы дня і пытанне паляпшэння савецка-польскіх гандлёвых адносін. Падпісаны ў ліпені 1932 г. «Дагавор аб ненападзенні» СССР і Польшчай, завяршаючы адзін з этапаў савецка-польскіх адносін, мог стаць асновай для іх уздыму на новы і больш высокі ўзровень. Але ён жа мог стаць і найвышэйшай кропкай у іх развіцці. Тая ці іншая яго роля залежыла ад таго, наколькі адпавядаў ён стратэгічным мэтам знешняй палітыкі абедзвюх дзяржаў. Савецкі ўрад, падпісваючы дагавор, як бы заяўляў аб тым, што ў бліжэйшы час не будзе выкарыстоўваць нацыянальны рух у Заходняй Беларусі і Украіне для спроб развалу Польскай дзяржавы, як гэта рабілася раней. З боку Польшчы было сведчаннем таго, што яе актыўная палітыка ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе, уздоўж заходніх межаў СССР не мае на мэце стварэння агрэсіўнага антысавецкага блока.

Адначасова з нармалізацыяй палітычных адносін наступае вядомае ажыўленне ў эканамічных адносінах – заключэнне мытных дамоў, падаўжэнне дагавора аб «Саўпольгандлі» (17 лютага 1933 г.), некаторае павелічэнне ўзаемных таваразваротаў, нармалізацыя пытання аб чыгуначных тарыфах, падпісанне канвенцыі аб сплаве лесу па памежных рэках (19 чэрвеня 1933 г.) і дамова аб экспарце драўніны, ажыўленне ўзаемнага транзіту праз польскія і савецкія парты. У сваю чаргу, пазітыўныя змены ў двухбаковых адносінах знайшлі сваё адлюстраванне на старонках польскага друку. Ключавымі тэмамі, якія хвалявалі прэсу Польшчы (з канца ліпеня 1932 г. і да сярэдзіны лістапада 1933 г.), сталі пытанні актывізацыі гандлёвых аперацый паміж савецкім і польскім бакамі, актыўна абгаворваліся планы па заключэнні гандлёвага дагавора.

Крыніцавую базу даследавання склалі «Зводкі польскага друку» за ліпень 1932 г. –лістапад 1933 г., якія рыхтаваліся прэс-бюро Паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Польшчы, іншыя матэрыялы польскага перыядычнага друку («Цодзённая газета гандлёва», «Кур'ер польскі», «Ілюстраваны кур'ер цодзённы», «Газета польска», «Газета Варшаўска»). Зводка польскага друку рыхтавалася або штодзённа, або за некалькі дзён, складалася з раздзелаў: Польшча–СССР, знешняя палітыка (звычайна падаваўся агляд польска-германскіх адносін), унутраная палітыка, эканамічнае становішча. Пры гэтым некаторыя падраздзелы маглі адсутнічаць, у залежнасці ад наяўнасці навін. Абсалютная большасць матэрыялаў утрымліваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (фонд 126 (Упраўленне ўпаўнаважанага Народнага камісарыята знешняга гандлю (НКЗГ) СССР пры СНК БССР), частка апублікавана ў зборніку дакументаў «Дакументы і матэрыялы па гісторыі савецка-польскіх адносін» [4].

Першапачатковае асмысленне тэмы адбываецца ў рамках публіцыстычных артыкулаў (І. Адамайціс [5], І. Тэумін [6]) і на старонках штогадовых аглядаў дзейнасці Упраўлення ўпаўнаважанага НКЗГ СССР пры СНК БССР [7]. У савецкай гістарыяграфіі варта вылучыць дысертацыю П.К. Краўчанкі [8], які знаходзіць заканамерным часовае паляпшэнне эканамічных савецка-польскіх адносін услед за падпісаннем пакта аб ненападзенні ў ліпені 1932 г. Сучасная расійская і беларуская гістарыяграфія адзначана распрацоўкамі А.В. Барыкіна [9] і Д.У. Раманоўскага [10]. У большасці сваёй у даследаваннях па праблеме ўтрымліваецца тэзіс аб узаемазалежнасці палітычных кантактаў і росту экспартна-імпартных аперацый, пашырэння навукова-культурных сувязяў паміж СССР і Польшчай.

Мэта даследавання: паказаць уплыў факта падпісання «Дагавора аб ненападзенні» 25 ліпеня 1932 г. на стан савецка-польскіх гандлёвых адносін на аснове польскага друку канца ліпеня 1932 г. – сярэдзіны лістапада 1933 г. Адзначаныя храналагічныя рамкі абмежаваны адмыслова: ад моманту падпісання «Дагавора аб ненападзенні» 25 ліпеня 1932 г. і да 16 лістапада 1933 г., часу падпісання польска-германскай канвенцыі аб ненападзенні. У даследаванні робіцца спроба прасачыць уплыў палітычнага фактару на развіццё гандлёвых адносін паміж СССР і Польшчай. Асноўнымі праблемамі, якія знаходзілі сваё адлюстраванне на старонках перыядычнага друку Польшчы, былі наступныя: уплыў «Дагавора аб ненападзенні» на стан гандлёвых адносін (планы па падпісанні гандлёвага дагавора), пытанне падаўжэння дагавора «Саўпольгандлю», накіраванне савецкай гандлёвай дэлегацыі на чале з намеснікам народнага камісара знешняга гандлю СССР Т.І. Боевым.

Напярэдадні падпісання «Дагавора аб ненападзенні», 19 ліпеня 1932 г., «Цодзённа газета гандлёва» публікуе інтэрв'ю з дырэктарам польска-савецкай гандлёвай палаты С. Яблонскім, які заявіў, што «ў гандлёвых абаротах паміж Польшчай і СССР рашаючую ролю адыгрываюць не столькі тарыфныя стаўкі, колькі агульнапалітычныя думкі». Імпарт

тавараў СССР у Польшчу складаў у 1930 г. 45,8 млн. злотых, экспарт на карысць Польшчы складаў вышэй 2 млн. злотых. У 1931 г. назіралася далейшае паляпшэнне гандлёвага баланса, які складаў 89,2 млн. злотых (імпарт) – 36, экспарт 125 млн. злотых. Вельмі адчувальным балючым месцам з'яўляецца недахоп капіталаў, неабходных для фінансавання польска-савецкіх гандлёвых абаротаў [11, арк. 139].

Падпісанне «Дагавора аб ненападзенні» 25 ліпеня 1932 г. паміж Польшчай і СССР выклікала імгненную рэакцыю з боку афіцыйных перыядычных польскіх выданняў. Так, 26 ліпеня на старонках «Газеты польскай» даецца ацэнка гэтаму дагавору, як «дамове, якая будзе мець істотнае значэнне для развіцця ўзаемнага даверу паміж абодвума бакамі і для ўсё болей цеснага мірнага іх сужыцця. Тым самым польска-савецкі пакт аб ненападзенні становіцца фактарам буйнога значэння для мірных адносін у цэлай Еўропе» [11, арк. 121]. У гэтым жа выданні 28 ліпеня з'яўляецца грунтоўнае інтэрв'ю міністра замежных спраў Польшчы А. Залескага карэспандэнту «Чыкага Дэйлі Ньюс». Ён заявіў, што падпісаны пакт з'яўляецца пашырэннем пакта Брыяна-Келага, г. зн. спробай надаць гэтаму пакту большую рэгіянальнасць, прыстасаваць да спецыяльных рэгіянальных умоў, якія пануюць на ўсходзе Еўропы. Аналагічныя пакты былі паралельна заключаны ў той жа час паміж прыбалтыйскімі дзяржавамі і СССР. Пакт адмаўляў вайну як нацыянальную палітыку [11, арк 104].

Дастаткова яўна праступаюць чаканні польскай грамадскасці, што палітычнае савецка-польскае збліжэнне паўплывае на ўмацаванне двухбаковых гаспадарчых сувязей. 28 ліпеня 1932 г. «Ілюстраваны кур'ер цодзённы» размяшчае інтэрв'ю варшаўскага карэспандэнта з былым міністрам прамысловасці і гандлю, дырэктарам Цэнтральнага саюза польскай прамысловасці М. Шыдлоўскім, які заявіў, што «пакт аб ненападзенні валодае несумненна вялікім значэннем для нашага гаспадарчага жыцця. Сярод перашкод павелічэння ўзроўню экспартна-імпартных аперацый адзначаліся цяжкасці прадстаўлення таварных крэдытаў». У інтэрв'ю выказваліся надзеі, што палітычнае збліжэнне краін так ці іначай прывядзе да заключэння гандлёвага дагавора і да павелічэння ўзаемнага тавараабарота [11, арк. 105].

У сваю чаргу, нягледзячы на пазітыўныя настроі ад «Дагавора аб ненападзенні», з'яўляюцца і негатыўныя ацэнкі. 24 жніўня 1932 г. у «Віленскім слове» быў размешчаны артыкул У. Студніцкага. Па меркаванні аўтара, «суседзі СССР не атрымалі ніякай новай гарантыі, яна не дала абавязацельстваў, якія б яе у чым-небудзь звязвалі. Наадварот, вынікам заключэння пакта з кожным з лімітрофаў па асобку СССР удалося перарваць адзіны фронт прыбалтыйскіх дзяржаў, Польшчы і Румыніі» [11, арк. 31]. 26 жніўня 1932 г. на старонках «Газеты Варшаўскай» з'яўляецца артыкул С. Рымара аб перспектывах польска-савецкага гандлю. У ім пералічваюцца асноўныя перашкоды на шляху заключэння гандлёвага дагавора паміж Польшчай і СССР. Сярод асноўных узгадваецца дзяржаўная манаполія савецкага знешняга гандлю, якая «з аднаго боку, аблягчае дамову, але, з другога боку, уносіць элемент няўпэўненасці, так як яна часта прымешвае да гандлёвых пытанняў агітацыйна-палітычныя моманты». Аўтар прыходзіць да высновы, што пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора, пакта аб ненападзенні эканамічнае збліжэнне Польшчы і СССР было б другім крокам наперад у накірунку поўнай пацыфікацыі Усходняй Еўропы [11, арк. 28].

Частай з'явай польскіх перадавіц адзначага перыяду было размяшчэнне не заўсёды праверанай інфармацыі. У першую чаргу гэта датычылася звестак аб пачатку савецка-польскіх перагавораў па заключэнні гандлёвага дагавора, якія пачаліся адразу ж пасля падпісання «Дагавора аб ненападзенні». Так, 29 жніўня 1932 г. у «Цодзённай газеце гандлёвай» змяшчаюцца разважанні аб карыснасці і мэтазгоднасці дагавора і падаецца не правераная інфармацыя аб «хуткім пачатку двухбаковых сустрэч па падрыхтоўцы гандлёвага пагаднення» [11, арк. 12]. 15 верасня 1932 г. на старонках адзначанага выдання ўбачыў свет артыкул прадстаўніка польскіх прамысловых колаў С. Натансона аб перспектывах польскага экспарту ў СССР у сувязі з рэалізацыяй другой пяцігодкі. Аўтар прыводзіць шэраг лічбаў, якія сведчаць аб хуткім росце прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці ў СССР, пры гэтым ён падкрэслівае, што рэалізацыя другой пяцігодкі «несумненна накіроўвае гандлёвую палітыку савецкага ўрада на задавальненне ўнутранага спажывання і прадставіць таксама іншым дзяржавам магчымасць экспарту ў Расію». У супрацьвес гэтым перспектывам аўтар указвае на тое, што "як раз у першым паўгоддзі 1932 г. заўважны сур'езны спад польскага

экспарту ў СССР", так як ён зменшыўся з 72 млн. злотых у першым паўгоддзі 1931 г. да 7,3 млн. злотых у 1932 г. Аўтар даказвае, што "адсутнасць гандлёвага дагавора з нашым усходнім суседам адмоўна адбіваецца на польскіх эканамічных зносінах" [12, арк. 399]. Гэты ж аўтар 15 кастрычніка на старонках "Часу" прапаноўвае праект разлікова-кампенсацыйнага гандлю, які б складаўся на 70 % з польскага экспарту і 30 % савецкага імпарту ў крэдыт. Для гэтага ён прапаноўвае стварэнне спецыяльнай Разліковай палаты (клірынгавай) і стварэнне сіндыката з польскіх фінансавых устаноў з капіталам у 30 млн. злотых. Памеры польскага экспарту ў СССР С. Натансон прадугледжвае ў 250 млн. злотых, а імпарту ў Польшчу з СССР – у 170 млн. злотых у год [12, арк. 141].

Адной з праблем, на якія звярталі ўвагу польскія газеты, стала падзенне ўзроўню польска-савецкага тавараабароту ў другім паўгоддзі 1932 г. у параўнанні з першым паўгоддзем і аналагічным перыядам 1931 г. 11 лістапада 1932 г. «Газета польска» робіць спробу знайсці прычыну гэтай з'явы. Сярод перадумоў адзначаюцца «празмерная залежнасць польскага і савецкага імпарту ад германскага рынку», жаданне савецкага боку па прадастаўленні доўгатэрміновага крэдытавання і «адсутнасць у савецкім экспарце ў Польшчу такіх артыкулаў, збыт якіх у Польшчы быў бы пастаянна забяспечаны» [12, арк. 144]. 29 лістапада 1932 г. «Газета польска гаспадарча» таксама адзначае «катастрафічнае падзенне польска-савецкага тавараабароту, які склаў за 9 месяцаў 1932 г. усяго каля 30 млн. злотых супраць 161 млн. у мінулым годзе». Пры гэтым адзначаецца, што «скарачэнне савецкага экспарту ў Польшчу адпавядае ў агульным скарачэнню ўсяго савецкага экспарту. У той жа час польскі экспарт у СССР у апошні час скараціўся непараўнальна мацней, чым польскі экспарт у цэлым. У выніку надзвычайнай беднасці наменклатуры польскага экспарту, апошні вельмі моцна адчувае розныя абмежаванні савецкіх заказаў». Пры гэтым указваецца, што значная частка віны падае на саміх жа прадстаўнікоў польскай прамысловасці, якія яўна недастаткова ацанілі значэнне СССР як рынку сбыту, пачаўшы перагаворы аб размяшчэнні сваёй прадукцыі на савецкім рынку толькі пад націскам рэзкай кан'юнктурнай дэпрэсіі [12, арк. 79].

Для двухбаковага абмеркавання гандлёвых праблем у канцы лістапада 1932 г. пачаў выходзіць у Варшаве часопіс «СССР і Польшча», які размяшчаў артыкулы на рускай і польскай мовах. Рэдакцыя вызначае мэту выдання «жаданнем садзейнічаць узнаўленню супрацоўніцтва Польшчы і СССР у галіне гаспадарчых адносін», праграмай жа свайго часопіса лічыць «дзелавую дыскусію на тэмы практычнай гандлёвай палітыкі і практычнай інфармацыі» для дзелавых колаў. Часопіс складаецца з шэрагу артыкулаў савецкіх і польскіх гандлёвых і прамысловых дзеячоў і некалькіх старонак рэкламных аб'яў. 7 снежня 1932 г. у гэтым часопісе з'яўляецца артыкул Ф. Аселя, прадстаўніка «Саўпольгандлю», у якім выразна падкрэслены ўсе цяжкасці, якія сустракае савецкі гандаль у Польшчы, пасіўнасць савецкага гандлёвага баланса па тавараабароту з Польшчай і даецца адказ польскаму друку, у якім абвінавачваецца СССР у празмерных патрабаваннях у галіне крэдыту. Артыкул сцвярджае поўную залежнасць далейшага развіцця савецка-польскага гандлю ад польскай гандлёвай палітыкі. Разглядалася магчымасць заключэння новай дамовы на пастаўкі ў СССР на аснове таварных кампенсацый і патрабуе вырашэння перш за ўсё пытання аб увозных кантынгентах для савецкіх тавараў у Польшчу на 1933 г. і аб фінансаванні заказаў у Польшчы [12, арк. 130].

Значным інфармацыйным повадам сталі перагаворы паміж польскімі і савецкімі прадстаўнікамі па падаўжэнні дагавора з «Саўпольгандлем». 31 снежня 1932 г. «Цодзённа газета гандлёва» адзначала, што польскія гаспадарчыя колы праяўляюць павышаную цікавасць да гэтых двухбаковых сустрэч з-за таго, што «падчас гэтых перагавораў абмяркоўваюцца адначасова магчымасці ажыўлення і паглыблення прамыслова-гандлёвых адносін паміж Польшчай і СССР». Па меркаванні газеты, гэтыя магчымасці вельмі значныя і да гэтага часу вельмі мала выкарыстаны. Аднак газета выказвае апасенне, каб «у сваім памкненні да павелічэння польскага экспарту, польскі бок не пайшоў бы на вельмі далёка ідучыя ўступкі, якія заключаюцца ў ліберальнай трактоўцы савецкага імпарту», што магло б выклікаць «дэмпінгавую палітыку коштаў з боку Саветаў», адбілася неспрыяльным чынам на некаторых галінах польскай прамысловасці, «напрыклад на польскай хімічнай прамысловасці, якая знаходзіцца перад пагрозай савецкага імпарту». Таму газета заклікае да таго, каб «перагаворы з Саветамі вяліся б з вялікай асцярожнасцю» [13, арк. 454]. Гэта

пытанне закраналася на старонках «Цодзённай газеты гандлёвай» 6 і 11 студзеня 1933 г. [13, арк. 434, 428]. У сваю чаргу, 18 студзеня 1933 г. «Газета варшаўска» адзначала цяжкасці, якія ўзніклі на перагаворах паміж прадстаўнікамі «Польраса» і «Саўпольгандлю». Галоўным праблемным момантам, па версіі выдання, стала вызначэнне плана гаспадарчага абмену паміж Польшчай і Саветамі ў рамках дзейнасці Змешанага імпартна-экспартнага таварыства «Саўпольгандаль». Савецкая дэлегацыя выступіла з шэрагам прапаноў, якія датычацца прызнання савецкім бокам мытных ільгот пры імпарце савецкіх тавараў у Польшчу. Польскі бок выразіў згоду і задаволіў некаторыя з гэтых патрабаванняў. Адначасова польскія прадстаўнікі пагадзіліся на змяншэнне ў 1933 г. экспарту з Польшчы ў СССР у памеры 500 млн. злотых. Перашкодай для завяршэння перагавораў з’яўлялася галоўным чынам пытанне фінансавага крэдыту ў памеры 250 тыс. долараў. Гэта польская прапанова сустрэла рашучае супраціўленне ў савецкага боку і ў выніку выклікала за сабой перапынак у перагаворах [13, арк. 356]. Адначасова, 20 студзеня 1933 г., «Газета варшаўска» адносна прычын зрыву перагавораў па падаўжэнні дагавора «Саўпольгандлю» адзначала «розніцу ў пунктах погляду паміж польскай і савецкай дэлегацыямі на аснове патрабаванняў савецкіх прадстаўнікоў па захаванні фінансавага крэдыту ў былых памерах» [13, арк. 349]. 30 студзеня 1933 г. «Нова Трыбуна» змяшчае інтэрв’ю намесніка гандлёвага прадстаўніка СССР у Польшчы М.І. Нюмберга, які адзначыў, што паміж польскім і савецкім бакамі была дасягнута дамоўленасць, зняты ўсе спрэчныя моманты, «ствараецца глеба для ўзнаўлення перагавораў. Яны павінны пачацца ў бліжэйшы час у Маскве» [13, арк. 310]. У выніку 17 лютага дагавор з «Саўпольгандлем» быў падоўжаны на 5 год.

Галоўны змест інтэрв’ю старшыні дэлегацыі польскіх прамыслоўцаў Е. Іваноўскага агентству «Іскра» адносна экспартна-імпартнага плана «Саўпольгандлю» на 1933 г. заключаецца ў вызначэнні колькасці і наменклатуры тавараў, якія павінны будуць вывозіцца з Польшчы ў СССР, і наадварот з СССР у Польшчу. «У бягучым годзе перагаворы аб падаўжэнні дагавора аб “Саўпольгандлі” шлі дастаткова доўга, каля чатырох месяцаў, што трэба патлумачыць галоўным чынам неабходнасцю ўвядзення ва ўзаемны абмен новых тавараў. Калі размова ідзе аб вывазе з Польшчы ў СССР, то ў 1933 г., згодна з экспартным планам, польскі бок зможа вывезці тавараў на суму прыблізна 20 млн. злотых, пры гэтым у першым паўгоддзі ўпершыню будуць уключаны ў наменклатуру тэкстыльныя тавары, а таксама прадукты сельскай гаспадаркі. Што датычыцца імпарту з СССР у Польшчу, то ён прадугледжвае ўвоз тавараў савецкага паходжання на суму каля 10 млн. злотых, пры гэтым у наменклатуры пералічаны рыба, скуры, рыззё, грыбы і ўпершыню аўтамабільныя шыны» [4, с. 27].

Важнай інфармацыйнай навіной стаў візіт савецкай гандлёвай дэлегацыі з 1 па 19 мая 1933 г. у Польшчу. У яе склад уваходзілі намеснік народнага камісара знешняга гандлю СССР Т.І. Боеў, члены калегіі НКЗГ А.М. Тамарын, М.І. Фірсаў, старшыні «Тэхнапрамімпарту», «Саюзметімпарту», «Станкаімпарту». У ходзе гэтага візіту адбыліся сустрэчы з дырэктарам «Саўпольгандлю» Ю. Зябіцкім, дырэктарам Гандлёвай палаты Польшчы і СССР С. Яблонскім, наведванне шэрагу польскіх металургічных прадпрыемстваў. Члены савецкай дэлегацыі (М.І. Фірсаў, Т.І. Боеў) далі вялікае інтэрв’ю на старонках «Кур’ера польскага», «Цодзённай газеты гандлёвай» [4, с. 41, 50, 54].

Нармалізацыя двухбаковых адносін, якая наступіла пасля падпісання «Дагавора аб ненападзенні», стала дадатковым штуршком да паляпшэння савецка-польскіх гандлёвых адносін. Аднак нельга перабольшваць палітычнага фактару, акрамя пашырэння намеклатуры тавараў (за кошт прадукцыі металургічнай, хімічнай, тэкстыльнай прамысловасці), вызначэння памераў крэдытных ільгот для савецкага боку, падаўжэння тэрміну дзеяння дагавора для «Саўпольгандлю» не назіраецца рэзкага росту тавараздвароту паміж бакамі, наадварот, праступае яўнае падзенне яго ўзроўню ў другім паўгоддзі 1932 г. у параўнанні з першым паўгоддзем і аналагічным перыядам 1931 г. Гэта яскрава заўважна па матэрыялах перыядычнага друку Польшчы канца ліпеня 1932 г. – сярэдзіны лістапада 1933 г. Асноўнай прычынай такога стану рэчаў была адсутнасць неабходных сродкаў для фінансавання польска-савецкіх гандлёвых абаротаў, агульны спад сусветнай эканомікі (рэзкая кан’юнктурная дэпрэсія), дзяржаўная манаполія савецкага знешняга гандлю.

**Літаратура**

1. Документы внешней политики СССР : в 24 т. / редкол.: Г. А. Белов [и др.]. – М., 1959. – Т. 3 : 1 июля 1920 г. – 18 марта 1921 г. – 723 с.

2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 126. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 15 ; Внешняя торговля СССР за 20 лет. 1918–1937 гг. Статистический справочник. – М., 1939. – 123 с.

3. НАРБ. Ф. 126. Воп. 1. Спр. 74. Арк. 108.

4. Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 11 т. / Ин-т славяноведения и балканистики АН СССР, Ин-т истории польско-советских отношений Польской АН ; отв. ред. И. А. Хренов, Т. Цесляк. – М. : Наука, 1969. – Т. 6 : 1933–1938 гг. – 434 с.

5. Адамайтис, И. Наш экспорт и внешний рынок (По материалам заграничной командировки) / И. Адамайтис // Савецкае будаўніцтва. – 1928. – № 5. – С. 2–5.

6. Теумин, И. Объединение Западной области с точки зрения внешней торговли / И. Теумин // Народное хозяйство Белоруссии. – 1922. – № 2–3. – С. 42–47.

7. Внешняя торговля Белоруссии в 1923–1924 хоз. Году : Очерк деятельности Управления уполномоченного Наркомвнешторга при СНК БССР и Государственной экспортно-импортной конторы «Госторгбел». – Минск, 1925. – 74 с.

8. Кравченко, П. К. Экономические и культурные связи БССР с зарубежными странами (1921–1932 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / П. К. Кравченко. – Минск, 1976. – 31 с.

9. Барынкин, А. В. Польша во внешнеполитической стратегии Советской России (1918–1919 гг.) : автореферат на дис. … канд. ист. наук : 07.00.15 / А. В. Барыкин. – СПБ., 2013. – 54 с.

10. Романовский, Д. В. Внешнеэкономические связи БССР с зарубежными странами (на примере работы Госторгбела в 1922–1931 гг.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Д. В. Романовский. – Минск, 2003. – 37 с.

11. НАРБ. Ф. 126. Воп. 1. Спр. 227.

12. НАРБ. Ф. 126. Воп. 1. Спр. 228.

13. НАРБ. Ф. 126. Воп. 1. Спр. 177.

Институт истории НАН Беларуси

Поступила в редакцию 03.01.2024